journalists
for tolerance

АСВЯТЛЕННЕ ПРАЯВАЎ НЯНАВІСЦІ

ДАВЕДНІК ПА ЭТЫЧНАЙ ЖУРНАЛІСТЫЦЫ

Як журналіст ці рэдактар, вы можаце

адыгрываць значную ролю ў пашырэнні інфармацыі пра віктымізацыю, якую спрычыньваюць злачынствы на глебе варожасці. Тое самае тычыцца і іншых відаў злачынстваў.

Аднак, зважаючы на тое, што злачынствы на глебе варожасці маюць больш разбуральнае ўздзеянне на ахвяраў і супольнасці, іх асвятленне ў інфармацыйных медыях патрабуе асаблівай адказнасці.

У гэтым даведніку разглядаюцца некаторыя пытанні, адказ на якія паспрыяе дасведчанаму асвятленню злачынстваў на глебе варожасці:

- Што такое “злачынства на глебе варожасці”?
- Якім чынам такія злачынствы могуць аказаць разбуральнае ўздзеянне на паасобных людзей і супольнасці?

- Якія крокі вы можаце зрабіць, каб зменшыць шкоду падчас асвятлення злачынстваў на глебе варожасці?

Ідэі, прадстаўленыя ў гэтым даведніку, былі агучаныя падчас Школаў талерантнасці для беларускіх журналістаў і рэдактараў. У рамках гэтых варштатаў іх удзельнікі вывучалі ўплыў і наступствы злачынстваў на глебе варожасці, а таксама вучыліся іх сацыяльна адказнаму асвятленню ў медыях.

ЗМЕСТ

ВЫЗНАЧЭННЕ

Што такое “злачынства на глебе варожасці”?

Законы аб злачынствах на глебе варожасці

Беларусь: злачынствы на глебе варожасці і закон

СУТНАСЦЬ

Злачынствы на глебе варожасці шкодзяць больш

Злачынствы на глебе варожасці могуць нанесці глыбокія раны

Злачынствы на глебе варожасці нясуць мэсыдж

ПАРАДЫ

Мінімізацыя пабочнай шкоды ад злачынстваў на глебе варожасці

Парады для чулага асвятлення злачынстваў на глебе варожасці

Што такое злачынства на глебе варожасці?

ПАХОДЖАННЕ

Ідэя пра тое, што некаторыя злачынствы могуць вылучацца ў асобны від “злачынстваў на глебе варожасці”, першапачаткова ўзнікла ў кааліцыях па інтарэсах, якія ўключалі ў сябе грамадскіх актывістаў, згуртаванні ахвяраў злачынстваў, а таксама прыхільных палітычных дзеячоў і дзяржаўных службоўцаў у Паўночнай Амерыцы ў 1970-х.

У 1990-я гэты тэрмін распаўсюдзіўся па другі бок Атлантыкі і стаў выкарыстоўвацца навукоўцамі, прадстаўнікамі крымінальнай юстыцыі і СМІ ў Вялікабрытаніі, а пазней і па ўсёй Еўропе, у першую чаргу ў скандынаўскіх краінах.

ВЫЗНАЧЭННЕ

Зважаючы на тое, што гэта – канцэпт, не існуе аднастайнага вызначэння тэрміну “злачынства на глебе варожасці”.

Найбольш шырока прымальнае вызначэнне “злачынства на глебе варожасці” прасоўваецца Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ. Паводле яго, “злачынствы на глебе варожасці” – гэта:

злачынныя дзеянні, матываваныя прадузятым стаўленнем або забабонамі ў дачыненні да пэўных груп людзей.

Паводле БДІПЧ АБСЕ, дзеля таго, каб правапарушэнне характарызавалася як “злачынства на глебе варожасці”, яно павінна адпавядаць двум крытэрыям:

па-першае, дзеянне мае падпадаць пад характарыстыкі злачынства ў рамках крымінальнага заканадаўства; па-другое, дзеянне з вялікай доляй верагоднасці мае быць выкліканае забабонамі.

Законы

аб злачынствах на глебе варожасці

ЕЎРОПА

У некаторых еўрапейскіх краінах увялі ў дзеянне так званыя “законы аб злачынствах на глебе варожасці”, якія прадугледжваюць больш жорсткае пакаранне асобам, асуджаным за здзяйсненне злачынстваў на глебе варожасці, у параўнанні з тымі, хто патрапіў на лаву падсудных за ўчыненне злачынстваў па іншых матывах.

ЕЎРАЗВЯЗ

У 2008 годзе было прынятае Рамачнае рашэнне Рады ЕС для краінаў Еўразвязу 2008/913/JHA па барацьбе з некаторымі формамі і выказваннямі расісцкага і ксенафобнага характару шляхам крымінальнага пераследу. Паводле гэтага дакумента расісцкая або ксенафобная матывацыя лічацца абцяжарваючымі абставінамі пры разглядзе крымінальных справаў і прадбачаюць прымяненне больш суровага пакарання.

Непрымальны фізічны гвалт пераследуецца паводле крымінальнага заканадаўства па ўсім свеце. У некалькіх краінах дзеянні фізічнага гвалту на глебе варожасці афіцыйна вызначаюцца і пераследуюцца паводле закона як “злачынствы на глебе варожасці”.

У шэрагу дзяржаваў формы вербальнага гвалту пераследуюцца ў рамках крымінальнага заканадаўства. Формы вербальнага гвалту на глебе варожасці таксама зрэдку пераследуюцца ў крымінальным парадку.

Зважаючы на гэта, у дадзеным даведніку паняцці “злачынства на глебе варожасці” і “гвалт на глебе варожасці” ўжываюцца ўзаемазамяняльна.

БЕЛАРУСЬ

ЗЛАЧЫНСТВЫ НА ГЛЕБЕ ВАРОЖАСЦІ І ЗАКОН

Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь (№275-З ад 9 ліпеня 1999 года з папраўкамі,

унесенымі Законам Рэспублікі Беларусь №409-З ад 13 ліпеня 2012 года) утрымлівае нормы аб узмацненні пакарання за ўчыненне злачынства на глебе варожасці:

- у выпадку забойства (артыкул 139);
- у выпадку наўмыснага прычынення цяжкага цялеснага пашкоджання (артыкул 147);
- у выпадку наяўнасці акалічнасцяў, якія абцяжарваюць адказнасць за здзейсненае злачынства (артыкул 64)

...у прыватнасці матываў расавай, нацыянальнай або рэлігійнай варожасці ці разладу, палітычнай або ідэалагічнай варажнечы, а таксама матываў варожасці ці нецярпімасці да той ці іншай сацыяльнай групы.

- Акрамя гэтага, у Крымінальным кодэксе

Рэспублікі Беларусь утрымліваюцца прававыя нормы аб пераследзе за наўмысныя дзеянні, скіраваныя на падбухторванне да расавай, нацыянальнай або рэлігійнай варожасці ці разладу, а таксама да прыніжэння нацыянальнага гонару і годнасці (артыкул 130).

Злачынствы на глебе варожасці

ШКОДЗЯЦЬ БОЛЬШ

Чаму да злачынстваў на глебе варожасці павінен быць іншы і нават патэнцыйна больш жорсткі падыход з боку судоў?

Міжнародная даследчыцкая група давяла навуковым чынам, што ахвяры злачынстваў, здзейсненых на глебе варожасці, церпяць больш за іншых.

У прыватнасці, існуе вялікая верагоднасць таго, што пасля нападаў ахвяры злачынстваў на глебе варожасці зазнаюць наступнае:

- **сацыяльна-эмацыйны разлад**
  праблемы на працы ці ў школе, сваркі з сямейнікамі або сябрамі, адчуванне меншага даверу да іншых і прага большай засамочанасці;

Псіхалагічны разлад

неспакой, злосць, засмучанасць, дэпрэсія, абстынентны сіндром (“ломка”), знерваванасць, страта упэўненасці, адчуванне ўразлівасці, згвалтаванасці, недаверу, небяспекі;

Псіхасаматычныя сімптомы

галаўны боль, праблемы са сном, змены звычак, звязаных з харчаваннем і піццём, нястраўнасць, стомленасць, высокі артэрыяльны ціск, сцятасць цягліцаў і боль у спіне.

ЗЛАЧЫНСТВЫ НА ГЛЕБЕ ВАРОЖАСЦІ МОГУЦЬ НАНЕСЦІ

ГЛЫБОКІЯ РАНЫ

Такім чынам, злачынствы на глебе варожасці могуць глыбока параніць чалавека, нашмат глыбей за шмат якія іншыя злачынствы.

Ахвяры злачынстваў на глебе варожасці і ўсе іншыя, хто падзяляе іх сацыяльную ідэнтычнасць, могуць успрыняць дзеянні агрэсара як напад на саму аснову іх існасці.

Нанесеная рана – гэта мэсыдж, які ляжыць за злачынствам, паводле якога і ахвяра, і ўсе іншыя, хто падзяляе яе сацыяльную ідэнтычнасць, абясцэньваюцца, робяцца непажаданымі, прыніжаюцца і зазнаюць пагарду.

У гэтым злачынствы на глебе варожасці адрозніваюцца ад падобных злачынстваў, якія ўчыняліся з іншай матывацыяй.

Мэсыдж, які дасылаецца ахвяры праз праяву

гвалту на глебе варожасці, – гэта мэсыдж выключэння.

У незалежнасці ад таго, ці маюць злачынцы тое на мэце, ці не, а ў некаторых выпадках яны робяць гэта напаказ, злачынствы на глебе варожасці – гэта дзеянні па маргіналізацыі і сацыяльным выключэнні. Гэта выключэнне з грамадзянскай супольнасці, да якой ахвяра лічыла сябе прыналежнай.

ЗЛАЧЫНСТВЫ НА ГЛЕБЕ ВАРОЖАСЦІ НЯСУЦЬ МЭСЫДЖ

Кожнае злачынства на глебе варожасці нясе пагрозу праявы гвалту ў будучым. Ахвяры носяць увесь час з сабою прычыну, па якой на іх могуць напасці. Сацыяльная ідэнтычнасць робіць іх патэнцыйнай мішэнню для агрэсараў.

Злачынства на глебе варожасці можа прынесці дадатковую шкоду праз пашырэнне

тэрарыстычнага мэсыджу сярод усіх, хто падзяляе сацыяльную ідэнтычнасць ахвяры: “Ты можаш быць наступным”.

Таму адмоўнае ўздзеянне злачынстваў на глебе варожасці можа значна пашырыцца з самой ахвяры на іншых асобаў з падобнай ідэнтычнасцю, якія пачуюць пра здзейсненае злачынства.

Мінімізацыя пабочнай

шкоды ад злачынстваў на глебе варожасці

Падчас асвятлення злачынстваў на глебе варожасці журналісты і рэдактары могуць пазбегнуць пабочнай шкоды, якая можа быць нанесеная ў дадатак да асноўнай, спрычыненай самім злачынствам.

Гэта не мае дачынення да абмежавання журналісцкай свабоды ці рэдакцыйнай незалежнасці падчас асвятлення падзеі.

Гэта датычыць узважанага падбору словаў, якія выкарыстоўваюцца ў зацемцы.

Таксама гэта датычыць узважанага выбару фокусу падчас асвятлення падзеі.

У дадатак гэта датычыць узважанага падбору крыніцаў, якія выкарыстоўваюцца падчас падрыхтоўкі інфармацыйнага паведамлення.

Усё гэта можа падацца відавочным шматлікім журналістам і рэдактарам. Аднак не ўсім. Каб зняць усе магчымыя пытанні, і быў створаны гэты даведнік па сацыяльна адказным і чулым асвятленні злачынстваў на глебе варожасці.



ПАРАДЫ ДЛЯ ЧУЛАГА АСВЯТЛЕННЯ

ЗЛАЧЫНСТВАЎ НА ГЛЕБЕ ВАРОЖАСЦІ

Замоўчванне праяваў гвалту на глебе варожасці вядзе да прыхоўвання іх негатыўнага ўплыву. У прыватнасці, замоўчванне дасылае мэсыдж аб тым, што пачуцці ахвяры нікому не цікавыя.

Не цурайцеся паведамляць пра выпадкі гвалту на глебе

варожасці

Прызнанне сур’ёзнасці злачынстваў на глебе варожасці дзяржавай і грамадзянскай супольнасцю з’яўляецца важным першым крокам у працэсе распрацоўкі адпаведнага рэагавання на іх праявы.

Масмедыі могуць адыгрываць жыццёва важную ролю ў павышэнні дасведчанасці аб дадзенай праблеме.

Мы рэкамендуем 10 асноўных прынцыпаў для чулага асвятлення злачынстваў на глебе варожасці:

Пазбягайце сенсацыйнай мовы

Загалоўкі створаныя для таго, каб

прыцягваць увагу і рабіць уплыў на аўдыторыю. Аднак застрашлівая або празмерна драматычная мова ў загалоўках можа пашыраць запалоханасць перад патэнцыйнай злачыннасцю.

Будзьце абачлівыя з выявамі

Фотаздымкі абразлівых графіці, экстрэмісцкай сімволікі, а таксама праяваў вандалізму ў дачыненні да надмагільных помнікаў або маёмасці могуць запалохваць людзей, наводзіць іх на думку пра тое, што яны могуць быць наступнай мішэнню для злачынцаў. Улічыце патэнцыйнае адмоўнае ўздзеянне гэтых выяваў на вашу аўдыторыю.

3

Не спекулюйце на правапарушальніках



Выказванне меркавання аб тым, што “скінхеды”, “неанацысты” ці “банды” стаяць за пэўнымі нападамі, можа спрычыніць паніку і з’яўляецца безадказным дзеяннем у выпадку адсутнасці доказаў.

4

Зводзьце да мінімуму ўвагу да злачынцаў

Для некаторых зламыснікаў за гонар убачыць навіну пра іх злачынства ў сродках масавай інфармацыі. Яны ведаюць, які тэрарыстычны эфект маюць іх злачынныя дзеянні. Не дапамагайце ім сеяць страх. І не дапамагайце ім у прасоўванні іх ідэалогіі.

Унікайце павелічэння шкоды ад злачынства на глебе варожасці

Расповеды пра “паніку”, “страх”, “шок” і “жах”, які зазнаюць супольнасці ў выніку злачынстваў на глебе варожасці, толькі паглыбляюць раны.

Не кажыце без дай прычыны пра хвалю злачынстваў

Адзінкавыя інцыдэнты, здзейсненыя не звязанымі паміж сабой правапарушальнікамі, не ствараюць хвалю злачынстваў.

Беспадстаўнае выказванне меркавання пра існаванне хвалі злачынстваў на глебе варожасці можа зменшыць давер да міліцыі і стварыць атмасферу страху.

Паведамляйце з асцярогай пра тэндэнцыі на аснове статыстыкі

Афіцыйная статыстыка злачынстваў, як вядома, не з'яўляецца надзейнай крыніцай для таго, каб рабіць высновы пра трэнды ў сферы злачыннасці. Яна часта адлюстроўвае нестабільнае атрыманне сведчанняў з боку ахвяраў і змены ў практыцы вядзення ўліку злачынстваў органамі ўнутраных спраў.

Перадавайце запэўніванні з боку міліцыі і дзяржслужбоўцаў

Заява міліцэйскага начальніка або кіраўніка мясцовай выканаўчай улады ці іншага дзяржслужбоўца вышэйшага звяна пра тое, што злачынства будзе дбайна расследаванае і злачынца будзе пакараны, можа запэўніць пацярпелыя супольнасці ў тым, што ўлады паказваюць сур'ёзнае стаўленне да злачынстваў на глебе варожасці.

Скіроўвайце чытачоў/слухачоў/гледачоў на рэсурсы падтрымкі

Згадка пра любую арганізацыю, якая

прапануе падтрымку ахвярам злачынстваў на глебе варожасці ў выпадку патрэбы, будзе карыснай для надання ўпэўненасці ахвярам і патэнцыйным ахвярам у тым, што яны не самотныя ў змаганні з наступствамі злачынства на глебе варожасці.

10 Распавядзіце пра паспяховыя выпадкі пакарання злачынцаў

Навіны пра паспяховае пакаранне правапарушальнікаў, якія здзейснілі злачынствы на глебе варожасці, таксама нададуць упэўненасці рэальным і патэнцыйным ахвярам у тым, што дзяржава прыцягне злачынцаў да адказнасці.

Аўтар **Пол Іганскі**
Пераклад на беларускую мову **Андрэй Клікуноў**
Рэдактар **Роберт Мілкавіч**
Дызайн і ілюстрацыі **Андра Вайнэа**

Пол Іганскі

iganski.org

@h8hurts

j4t journalists for tolerance

http://j4t.by

Варштаты для беларускіх журналістаў адбыліся пры паважнай падтрымцы збоку Lancaster University Kickstarter Global Challenges Research Funds, Lancaster University Impact Acceleration Funds, а таксама FASS Research Impact Funds.

7 снежня 2019 г.

© 2019 Paul Iganski & J4T